## В Шумилинском историко-краеведческом музее открыли выставку репродукций картин Николая Рериха

Культура

06.12.2019 shumilino

Дакрануцца да спадчыны Мікалая Рэрыха. Урачыстае адкрыццё-прэзентацыя выставы рэпрадукцый карцін вядомага рускага мастака Мікалая Рэрыха “**У пошуках гармоніі**” адкрылася напрыканцы мінулага тыдня ў выставачнай зале Шумілінскага гісторыка-краязнаўчага музея.



На мерапрыемства прыехалі госці: Маісеенка Валянціна Іванаўна, намеснік старшыні Віцебскага аддзялення РГА “Рускае таварыства пры пасольстве Расіі ў Беларусі”, і Пшонка Андрэй Мікалаевіч, супрацоўнік РГА “Беларускі фонд Рэрыхаў”. Гэтыя людзі ведаюць пра жыццё і творчасць М. К. Рэрыха ўсё і нават

больш і з вялікім задавальненнем знаёмілі прысутных з яго ідэямі і творчай спадчынай.



***Андрэй Пшонка перадае супрацоўніцы музея Таццяне Цэрах кнігі М. Рэрыха.***

З вітальным словам звярнулася да ўдзельнікаў мерапрыемства В.І.Маісеенка. Яна адзначыла, што за магчымасць пазнаёміцца з адной з граняў творчасці Мікалая Канстанцінавіча Рэрыха мы павінны быць удзячныя грамадскаму аб’яднанню “Беларускі фонд Рэрыхаў”, якое на ўласныя сродкі ў канцы 90-х гг. набыло ў Самары факсімільныя копіі карцін мастака і цяпер знаёміць з імі беларусаў.

Мікалай Канстанцінавіч Рэрых (1874-1947) належаў да ліку ўнікальных рускіх мастакоў 20 стагоддзя з індывідуальным стылем. За сваё жыццё ён стварыў так многа, як быццам у ім былі закладзены фізічныя і духоўныя сілы адразу некалькіх людзей. Пачаў Рэрых свой творчы шлях у Расіі, а закончыў у Індыі. Гэта быў мастак, які пакінуў у спадчыну больш за 7 тысяч карцін, вучоны-археолаг, дэкаратар, юрыст, пісьменнік з літаратурнай спадчынай у 29 тамоў, падарожнік, буйны грамадскі дзеяч, ініцыятар захавання культурнай і духоўнай спадчыны чалавецтва. Ён валодаў выключным талентам гістарычнага жывапісца, якому ўдалося спалучыць жывапіс і іканапіс. У той жа час вы-значыць дакладна жанр яго карцін і напрамкі жывапісу немагчыма – настолькі вялікі размах, неардынарнасць і глыбіня думкі.

На выставе ў Шуміліне прадстаўлены 20 рэпрадукцый карцін мастака.

В. І. Маісеенка правяла невялікую аглядавую экскурсію і расказала пра жыццё Рэрыха, гісторыю стварэння серыі работ “Sancta”, што ў перакладзе

азначае “Свяшчэнная”. Ідэйную аснову карцін складае духоўнае вучэнне вялікага рускага падзвіжніка Прэпадобнага Сергія Раданежскага, якога асабліва шанавалі ў сям’і Мікалая і Алены Рэрыхаў.

Падчас прэзентацыі адбыўся цікавы дыялог удзельнікаў наконт духоўных ідэй вядомага мастака, яго філасофскага вучэння. Андрэй Мікалаевіч Пшонка падарыў музею і раённай бібліятэцы кнігі з манаграфіямі М. Рэрыха і параіў бліжэй пазнаёміцца з літаратурнымі творамі Мікалая Канстанцінавіча, бо ў іх можна знайсці адказы на многія пытанні, якія хвалююць людзей: хто ёсць чалавек, у чым сэнс яго існавання, як навучыцца валодаць мастацтвам, як жыць у згодзе з бліжнімі.

Выстава будзе працаваць да сярэдзіны студзеня**. Так што ў кожнага ёсць магчымасць дакрануцца да дзіўнага светабачання мастака, атрымаць зарад энергіі, якую нясуць карціны.**

Алена КАРПУШЭНКА.

Апублікавана ў №95 ад 06.12.2019 г.

http://www.shumilino.by/?p=51677